ЕС для Беларусі
EU4Digital

# Гарманізацыя лічбавых рынкаў у краінах Усходняга партнёрства

Ініцыятыва **EU4Digital** спрыяе пашырэнню пераваг **адзінага лічбавага рынку Еўрапейскага саюза** на краіны Усходняга партнёрства. Падтрымка ЕС будзе накіравана на развіццё патэнцыялу **лічбавай эканомікі і грамадства**, каб забяспечыць эканамічны **рост**, стварыць **новыя працоўныя месцы, палепшыць узровень жыцця насельніцтва** і **дапамагчы бізнесу** ў Арменіі, Азербайджане, Беларусі, Грузіі, Рэспубліцы Малдова і Украіне.

## ПРЫЯРЫТЭТНЫ НАПРАМАК

Гарманізацыя лічбавых рынкаў з'яўляецца адной з **20 практычных вынікаў на перыяд да 2020 года**, накіраваных на паляпшэнне штодзённага жыцця грамадзян Усходняга партнёрства.
У рамках стратэгіі, у якой выкладаюцца 20 вынікаў, ЕС заяўляе, што **«лічбавая эканоміка з'яўляецца галіной з пакуль яшчэ не раскрытым патэнцыялам для сацыяльна-эканамічнага развіцця, а таксама для забеспячэння росту і стварэння працоўных месцаў як для ЕС, так і для краін-партнёраў»**.

## Ініцыятыва EU4Digital аб'ядноўвае прыярытэтныя дзеянні і праграмы ЕС:

**Прафесійныя сеткі EU4Digital,** створаныя ў 2016 годзе, якія аб'ядноўваюць прадстаўнікоў краін Усходняга партнёрства і краін-членаў ЕС для працы ў ключавых тэматычных накірунках

**EU4Digital: падтрымка лічбавай эканомікі і грамадства ў краінах Усходняга партнёрства,** трохгадовы праект (2019-2022), які развівае ключавыя галіны лічбавай эканомікі і грамадства ў адпаведнасці з нормамі і практыкай ЕС

**EU4Digital - стратэгіі па развіцці шырокапалоснага доступу ў рэгіёне Усходняга партнёрства** (2018-2020), праект, які ажыццяўляецца Сусветным банкам для падтрымкі краін Усходняга партнёрства ў распрацоўцы і рэалізацыі нацыянальных стратэгій у галіне шырокапалоснай сувязі

Праграма ЕС па **CYBER,** якая знаходзіцца ў распрацоўцы і будзе накіравана на ўмацаванне кібербяспекі ў краінах-партнёрах і павышэння даверу да выкарыстання лічбавых паслуг

Пашырэнне лічбавай эканомікі і грамадства спрыяе эканамічнаму росту, стварае працоўныя месцы, паляпшае жыццё грамадзян і дапамагае бізнесу праз:

- **павышэнне якасці** анлайн-паслуг, **зніжэнне кошту** і **пашырэнне выбару** паслуг
- **павелічэнне** аб'ёму **інвестыцый**, **гандлю**, стварэнне **новых працоўных месцаў**
- **паскарэнне запуску** ІКТ экасістэмы і росту кампаній

Праект працуе ў шасці тэматычных галінах для падтрымкі дзейнасці сетак EU4Digital па стварэнні асновы для паляпшэння лічбавай эканомікі і грамадства на карысць бізнесу і грамадзян:

# EU4DIGITAL: ПАДТРЫМКА ЛІЧБАВАЙ ЭКАНОМІКІ І ГРАМАДСТВА Ў КРАІНАХ УСХОДНЯГА ПАРТНЁРСТВА

### Нормы тэлекамунікацыйнага сектара

- Дасягненне **агульнай прасторы роўмінгу** да 2020 года
- Падтрымка **нацыянальных тэлекамунікацыйных рэгулятараў**
- **Гарманізацыя размеркавання спектра частот**

### Інавацыі ў сферы ІКТ

- Развіццё даследаванняў у галіне **ІКТ, стартапаў** і **інавацыйных экасістэм**

### Электронны гандаль

- Спрыянне гандлю шляхам распрацоўкі агульных рамак для рэгулявання:

  - **электроннай камерцыі**
  - **электроннай мытні**
  - **электроннай лагістыкі**

- Распрацоўка пілотнага **лічбавага транспартнага калідора**

### Лічбавыя навыкі

- Распрацоўка **стратэгій лічбавых навыкаў**
- **Сістэма лічбавых кампетэнцый** для малых і сярэдніх прадпрыемстваў

### Давер і бяспека

- Трансмежны **электронны подпіс**
- Рэгіянальная структура **трансмежных электронных паслуг** для бізнесу
- **Стратэгіі кібербяспекі** для забеспячэння ўстойлівасці крытычна важнай інфраструктуры

### Электронная ахова здароўя

- **Гарманізаваныя нацыянальныя рамкі электроннай аховы здароўя** паміж краінамі Усходняга партнёрства і ЕС
- Трансмежная **платформа электроннай аховы здароўя**

**Фінансуецца Еўрапейскім саюзам у рамках ініцыятывы EU4Digital**